УДК 94(44)+329

# НЕАФАШЫСЦКІ РУХ У ФРАНЦЫІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***А. М. Грышэль***
аспірант
Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы

*У артыкуле разглядаюцца і параўноўваюцца пазіцыі найбольш значных неафашысцкіх арганізацый і груп у Францыі: "Еўропа – Дзеянне", "Захад", "Група даследаванняў еўрапейскай цывілізацыі", "Арганізацыя тайнай арміі", "Група Карла Мартэла", "Абарончы саюз", "Новы парадак" і г. д. Устаноўлена, што існаванне значнай колькасці неафашысцкіх арганізацый пасля Другой сусветнай вайны было абумоўлена не толькі саперніцтвам іх лідараў, але і ідэйнымі рознагалоссямі. Аўтар зрабіў выснову, што дзейнасць сучасных ультраправых носіць абмежаваны характар, але ў пэўных умовах ультраправыя могуць актывізавацца і прыйсці да ўлады. Нарастанне тэрарыстычнай і іміграцкай пагроз спрыяе росту папулярнасці ультраправых.*

**Ключавыя словы:** неафашысты; ультраправыя; нацыяналізм; расізм; тэрарызм; алжырская вайна; Нацыянальны фронт.

## Уводзіны

Важнейшай праблемай французскай палітычнай гісторыі застаецца дзейнасць неафашысцкіх арганізацый і іх уплыў на сучаснае грамадства. Вядома, што пасля Другой сусветнай вайны ў Францыі існаваў шэраг арганізацый, якія ў сваёй дзейнасці абапіраліся на фашысцкую ідэалогію, што не магло не адлюстравацца на французскім грамадстве. Таму ў артыкуле разглядаюцца найбольш яркія неафашысцкія арганізацыі пасляваеннага перыяду. Праблема недастаткова вывучана французскімі і айчыннымі гісторыкамі, увага якіх сканцэнтравана на аналізе дзейнасці даваенных французскіх фашысцкіх арганізацый, а таксама на вывучэнні найбольш моцнай сучаснай ультраправай партыі "Нацыяльны фронт", уплыў якой хутка расце у свеце нявырашанасці шэрагу сацыяльна-эканамічных пытанняў. Сярод даследчыкаў, якія займаліся падобнай праблематыкай, трэба адзначыць В. Віпермана [1], С. Ваксмана [2], А. Мэстра [3], Б. Феньё [4], Ю.Ф. Харланава [5], Н.Ю. Васільеву [6], Ж.-І. Камю [7].

Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз развіцця французскага неафашысцкага руху пасля Другой сусветнай вайны.

## Асноўная частка

Паражэнне фашысцкай Італіі і нацысцкай Германіі ў Другой сусветнай вайне не азначала, што фашызм як ідэалогія спыніў сваё існаванне, але ў пасляваенны час ніводная неафашысцкая партыя не змагла заручыцца настолькі значнай падтрымкай насельніцтва, каб прыйсці да ўлады. Па сваёй структуры пасляваенныя неафашысцкія арганізацыі амаль не адрозніваліся ад даваенных. Як правільна адзначаў В. Віперман, калі б неафашысцкія арганізацыі адрозніваліся ад тых, што ўзніклі да 1945 г., да іх неабходна было б прымяняць іншы тэрмін [1].

У пасляваеннай Францыі перыядычна ўзнікалі невялікія неафашысцкія групы. Да іх ідэй і лозунгаў французы ставіліся насцярожана, а часам агрэсіўна. Былі выпадкі, калі актывісты гэтых груп праследаваліся з боку антыфашыстаў. Алжырскі крызіс прывёў да палітычнага крызісу, а таксама да адраджэння фашысцкай ідэалогіі. У сваю чаргу, саперніцтва паміж лідарамі асобных неафашысцкіх арганізацый прывяло да расколу руху і яго драблення. Практычна ўсе створаныя ў канцы 1950-х – 1960-я гг. ультраправыя арганізацыі так ці інакш былі звязаны з алжырскай вайной і неафашысцкай ідэалогіяй.

22 снежня 1949 г. нацыяналістамі П. Сідо, Ж. Сідо, Ж. Вагнерам, Ж. Маро быў створаны рух "Маладая нацыя" [8, р. 18]. У 1950-я гг. рух здзейсніў шэраг актаў гвалту, таму 15 мая 1958 г. французскі ўрад на чале з П. Пфлімлінам выдаў дэкрэт аб роспуску "Маладой нацыі". Рашэнне было прынята на фоне арганізаванага 13 мая 1958 г. путчу французскіх пасяленцаў у Алжыры, якіх падтрымала частка ваенных [9, с. 194]. "Маладая нацыя" адмовілася падпарадкавацца рашэнню ўрада. У 1959 г

© Грышэль А. М., 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яна была перафарматавана і атрымала новую назву – "Нацыяналістычная партыя". У новым выглядзе яна праіснавала вельмі кароткі перыяд. 1 мая 1960 г. большая частка яе членаў увайшла ў склад "Федэрацыі студэнтаў-нацыяналістаў", якая прытрымлівалася антыкамуністычных поглядаў, лічыла сваёй мэтай ахову Францыі ад камунізму, выступала супраць незалежнасці Алжыра.

У 1963 г. у шэрагах "Федэрацыі студэнтаў-нацыяналістаў" адбыўся раскол. Частка актывістаў на чале з Д. Венэрам, які прытрымліваўся ідэі еўрапейскага нацыяналізму, у рамках "Федэрацыі студэнтаў-нацыяналістаў" стварыла рух "Еўропа – Дзеянне". Астатнія заснавалі рух "Захад", які праіснаваў да кастрычніка 1968 г., а затым увайшоў у склад "Новага парадку". Канчаткова "Федэрацыя студэнтаў-нацыяналістаў" спыніла дзейнасць у 1967 г.

Рух "Захад" быў заснаваны ў красавіку 1964 г. парыжскімі студэнтамі, якіх выключылі з "Федэрацыі студэнтаў-нацыяналістаў" за непадпарадкаванне. Па розных ацэнках, у 1968 г. рух налічваў ад 800 да 1500 прыхільнікаў. "Захад" не імкнуўся да абнаўлення ідэалогіі, як "Еўропа – Дзеянне". Яго прыхільнікі не хавалі нацыяналістычных поглядаў, лічылі, што лібералізм з'яўляецца галоўным ворагам нацыяналізму, узвышалі французскую нацыю, спачувалі пісьменніку Р. Бразільяку, расстралянаму ў 1945 г. за калабарацыянізм, а таксама засталіся на ярка акрэсленых антыкамуністычных пазіцыях. Яны лічылі, што фашызм – гэта праява нацыяналізму, а асноўнымі яго прыхільнікамі з'яўляюцца маладыя людзі, схільныя да рэвалюцыі. "Захад" заклікаў фізічна знішчаць камуністаў, заклікаў паўтарыць шлях Сухарта, які забіў сотні тысяч камуністаў у Інданезіі. Рух падтрымаў пераварот у Грэцыі 21 красавіка 1967 г. У канчатковым выніку "Захад", заснаваны на маладзёжнай рэвалюцыйнасці, зжыў сябе. 31 кастрычніка 1968 г. ён быў афіцыйна распушчаны [10]. Сёння былыя ўдзельнікі "Захаду" – П. Жалінэ, П. Дэведжан, Э. Навела – шкадуюць, што прытрымліваліся радыкальных пазіцый [11]. П. Дэведжан адзначыў, што нельга параўноўваць Нацыянальны фронт з арганізацыямі 1960-х гг., таму што яны не маюць нічога агульнага і ўзніклі ў розны час.

У аснове руху "Еўропа – Дзеянне" знаходзілася пабудаваная на біялагічным расізме дактрына "нацыяналістычнай рэвалюцыі". Яго лідары імкнуліся стварыць моцную дысцыплінаваную арганізацыю. Актывістамі была ўспрынята ідэя еўрапейскага нацыяналізму, якая прадугледжвала перавагу не адной нацыі, а ўсёй заходняй цывілізацыі. "Еўропа – Дзеянне" выступала супраць міжрасавых шлюбаў і афрыканскай іміграцыі, а таксама супраць хрысціянства, бо яно было семіцкай рэлігіяй [8, p. 19]. Не вытрымаўшы крытыкі з боку апанентаў, рух быў вымушаны спыніць дзейнасць у 1967 г.

"Еўропа – Дзеянне" паслужыла асновай для створанай у 1968 г. французскімі нацыяналістамі "Групы даследаванняў еўрапейскай цывілізацыі". Яе ідэйным натхняльнікам лічыцца А. дэ Бенуа, сутнасць пазіцыі якога зводзілася да таго, што заўсёды існавала няроўнасць, і таму каштоўнасць кожнага чалавека розная. Пры гэтым ён адзначаў, што не супраць камуністаў і іншых левых. Ён проста не разумеў іх ідэю роўнасці [12, p. 16]. А. дэ Бенуа заўсёды крытыкаваў неалібералізм, дэмакратыю, эгалітарызм, з'яўляўся прыхільнікам пан'еўрапейскага нацыяналізму. Гісторык А. Шабэль лічыў, што А. дэ Бенуа і яго група спрыялі распаўсюджванню неафашызму ў Францыі.

З сучаснымі ультраправымі А. дэ Бенуа збліжае пазіцыя ў дачыненні да імігрантаў. У той жа час ён крытыкаваў Ж.-М. Ле Пэна за яго расісцкія і антысеміцкія выказванні. Парадаксальна, што прыхільнікі А. дэ Бенуа адначасова спачувалі Ж.-М. Ле Пэну [2]. А. дэ Бенуа не меў нічога супраць мусульман, але лічыў, што яны не павінны прыязджаць у Еўропу. Ён адмоўна ставіўся да хрысціянства, бо яно схільна да праследаванняў. Напісаў некалькі кніг, прысвечаных абвяржэнню біялагічнага расізму. Сёння ён выступае супраць узмацнення ўплыву ЗША. Лічыць, што нацыянальныя дзяржавы зжылі сябе, ім на змену павінны прыйсці рэгіянальныя федэрацыі. У гэтым пазіцыя А. дэ Бенуа

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

збліжаецца з ультраправым Блокам ідэнтычнасці.

“Група даследаванняў еўрапейскай цывілізацыі” працягвае функцыяніраваць у цяперашні час. Яе актывісты называюць сябе “новымі правымі”. Піка папулярнасці яна дасягнула ў канцы 1970-х гг., калі ў яе склад уваходзіла каля 4 тыс. чал. Зараз яна мае афіцыйны сайт, друкаваныя органы: штогадовы часопіс “Новая школа” (з 1968 г), часопіс “Элементы” (з 1973 г.) і штоквартальны часопіс “Крызіс” (з 1988 г.). Калі “Новая школа” канцэнтрue ўвагу толькі на філасофскіх, рэлігійных і культурных пытаннях, то тэматыка “Элементаў” і “Крызісу” значна больш шырокая. Часопіс “Крызіс” (А. дэ Бенуа называе яго метапалітычным) імкнецца на сваіх старонках звесці “левых” і “правых”, каб весці дыскусіі па актуальных пытаннях. Нягледзячы на намаганні, аўдыторыя часопіса застаецца абмежаванай і зараз налічвае не больш за 600 падпісчыкаў [3].

Аўтары артыкулаў, што друкуюцца ў “Элементах”, звяртаюцца да шырокага кола праблем. На старонках часопіса яны разважаюць наконт глабалізацыі і выказваюць надзею на тое, што ў будучым магчыма дэглабалізацыя, крытыкуюць кансерватараў-рэакцыянераў і спрабуюць іх пераканаць у тым, што кожная гістарычная падзея ўнікальна і ніколі не паўтараецца [13]. Гаворачы словамі К. Маркса, кансерватары імкнуцца “перавярнуць уверх дном кола гісторыі”, пры гэтым не могуць аргументаваць, для чаго гэта патрэбна. Аднойчы адзін з журналістаў “Элементаў” задаў пытанне манархістам з Аксьён франсэз: “Чаму вы лічыце, што кароль патрэбны Францыі?”. Адказ ашаламіў журналіста: “Таму што гэта прыгожа!” [14].

Крыху раней, у 1953 г., па ініцыятыве П. Пужада быў створаны “Саюз абароны прамысловасці і рамеснікаў”, які першапачаткова змагаўся супраць павелічэння падаткаў. У далейшым арганізацыя стала разумецца як саюз простых грамадзян, якія змагаюцца за свае правы. Прыхільнікам пужадызму быў Ж.-М. Ле Пэн, што дае падставу некаторым даследчыкам лічыць Нацыянальны фронт фашысцкім. Сапраўды, у “Саюзе абароны прамысловасці і рамеснікаў” выказваліся нацыяналістычныя і антысеміцкія заклікі, аднак прыхільнікаў такіх поглядаў была пераважная меншасць. Па сваёй сутнасці пужадызм з’яўляўся антымадэрнісцкім рухам.

Калі пужадысты адмаўляліся выкарыстоўваць зброю ў палітычнай барацьбе, то тыя арганізацыі, што ўзніклі непасрэдна ў Алжыры, з самага пачатку прытрымліваліся тэрарыстычных метадаў. Самай вядомай падобнай арганізацыяй была “Арганізацыя тайнай арміі” (АТА). З усіх створаных пасля 1945 г. неафашысцкіх арганізацый ідэалогія АТА ў найбольшай ступені супадала з фашысцкай. АТА была прасякнута нацыяналістычнымі, антыкамуністычнымі, антысацыялістычнымі і антыдэмакратычнымі ідэямі, поглядамі і лозунгамі. АТА была створана П. Лагаярдам, Р. Саланам, Ж.-Ж. Сюзіні ў студзені 1961 г. і стала своеасаблівым адказам на рэферэндум аб незалежнасці Алжыра. Першапачаткова створаная для барацьбы супраць руху за незалежнасць Алжыра ад Францыі, з цягам часу яна стала выступаць супраць усіх палітыкаў, якія імкнуліся ўрэгуляваць канфлікт, у першую чаргу супраць Ш. дэ Голя.

Б. Феньё, які вывучаў АТА, засцерагаў ад ўспрымання АТА выключна як групы забойцаў, паколькі яе праграма, прынцыпы, метады – гэта фашызм у дзеянні ў тагачасных умовах. У яе “Папярэдняй праграме, якая можа паслужыць асновай праграмы нацыянальнай рэканструкцыі”, прапаноўвалася: стварыць нацыянальны ўрад грамадскага выратавання з удзелам адказных прадстаўнікоў французскага нацыяналістычнага руху і іх прыхільнікаў у арміі; распусціць французскі парламент; склікаць Савет нацыі, які прадстаўляў бы розныя прафесійныя карпарацыі і тэрыторыі (па аналогіі з сістэмай Б. Мусаліні); распусціць усе партыі і г. д. [4, с. 41–42].

АТА вяла актыўную тэрарыстычную дзейнасць і ў жніўні 1962 г. арганізавала замах на Ш. дэ Голя ў парыжскім прыгарадзе Кламар. Ахвярамі АТА былі не толькі палітычныя дзеячы, але і простыя грамадзяне, як, напрыклад, пасажыры цягніка “Страсбург – Парыж”: у выніку выбуху каля Вітры-ле-Франсуа

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

18 чэрвеня 1961 г. загінула 28 чал., што доўга заставалася самым масавым тэрактам у Францыі да 13 лістапада 2015 г. [15].

Амаль што адразу пасля падпісання Эвіанскіх пагадненняў АТА назвала акупантамі французскіх салдат [16]. Адпаведна, тэрактаў, накіраваных супраць ваенных, стала значна больш. АТА не засмучала тое, што на рэферэндуме 8 красавіка 1962 г. больш за 90% французаў выказалася за прадастаўленне незалежнасці Алжыру [17, p. 681]. Бачучы, што дамовіцца з АТА немагчыма, Ш. дэ Голь прыклаў усе сілы, каб разграміць яе да 1963 г

Адзначым, што адносіны паміж АТА і этнічнымі алжырцамі былі напружанымі. АТА разглядала іх як людзей другога гатунку, а тыя бачылі ў АТА акупантаў. Адзін з алжырцаў у інтэрв'ю газеце "Ліберасьён" казаў: "Калі б нам далі магчымасць заняцца АТА, то яна была б ліквідавана ў Алжыры за некалькі дзён" [18, с. 131]. Варта адзначыць, што абодва бакі вялі сябе агрэсіўна, і калі б не французская армія, то ахвяр вайны было б значна больш.

Сёння сярод ультраправых ёсць тыя, хто спачувае АТА. Увечары 4 ліпеня 2006 г. яны ўрачыста запалілі агонь каля помніка Невядомаму салдату ў Парыжы. Дзеянне было прысвечана чарговай гадавіне разні ў алжырскім горадзе Аране, калі 5 ліпеня 1962 г., нягледзячы на падпісаныя раней пагадненні, атрады алжырскага левага Фронту нацыянальнага вызвалення забілі больш за 3,5 тыс. еўрапейцаў [5].

Праз 10 гадоў пасля разгрому АТА была створана ўльтраправая "Група Карла Мартэла", якая дзейнічала пераважна ў Парыжы і на поўдні Францыі, у раёне Праванса. Яна выкарыстоўвала тэрарыстычныя метады і займалася забойствам арабаў і тых французаў, якія падтрымлівалі незалежнасць Алжыра. Сваю дзейнасць група пачала 14 снежня 1973 г. з атакі на алжырскае консульства ў Марсэлі, у выніку якой было забіта 4 чалавекі 10 красавіка 1975 г. у знак пратэсту супраць наведвання прэзідэнтам В. Жыскар д'Эстэнам Алжыра быў узарваны аўтамабіль каля алжырскага консульства ў Парыжы. 22 лютага 1982 г. члены "Групы Карла Мартэла" адкрылі стральбу ў бары ў выхадцаў з Паўночнай Афрыкі, у выніку якой раненні атрымалі 3 чалавекі. 14 сакавіка 1983 г. двое мужчын на матацыкле кінулі бомбу, ад якой сур'ёзныя раненні атрымалі двое дзяцей [19].

Гэта толькі некалькі фактаў дзейнасці "Групы Карла Мартэла". У студзені 1974 г. у пасланні, адрасаваным прэзідэнту Францыі Ж. Пампіду, лідары групы спрабавалі апраўдаць гвалт настальгіяй па тым, што калісьці Алжыр быў часткай Францыі, а таксама страхам пранікнення ў Францыю занадта вялікай колькасці арабаў [20, p. 255–256].

Пасля АТА ў Францыі існавала некалькі неафашысцкіх арганізацый, якія былі аб'яднаны тым, што настальгіравалі па страце Алжыра. Да іх можна аднесці:

1) рух "Маладая рэвалюцыя", створаны ў 1966 г. былымі салдатамі АТА, сярод якіх былі М. Каліно, Н. Каянакіс, Ж.-П. Сцірбуа, П. Сержан;

2) групу "Абарончы саюз", якая была створана ў снежні 1968 г. А. Рабэрам, Ж. Лонгам. У лістападзе 1974 г. яна ўвайшла ў склад "Партыі новых сіл", часта заключала і разрывала дамоўленасці з іншымі групамі, практычна спыніла дзейнасць у 1980-х гг., ператварыўшыся ў маргінальную сілу, не вытрымаўшы саперніцтва з Нацыянальным фронтам;

3) "Новы парадак", які ўзнік у 1969 г. Яго сімвалам быў кельцкі крыж. Крэда "Новага парадку" заключалася ў адраджэнні патрыятызму, прапагандзе сямейных каштоўнасцей. З-за сутыкненняў з ультралевымі на глебе адносін да імігрантаў, якія адбыліся ў чэрвені 1973 г., урад Францыі прыняў рашэнне распусціць "Новы парадак", а таксама ультралевую "Камуністычную лігу", прадэманстраваўшы, што не дапусціць беспарадкаў [21]. Пасля роспуску большая частка актывістаў "Новага парадку" ўвайшла ў склад Нацыянальнага фронту. Тыя, хто не быў згодны з курсам Нацыянальнага фронту, у лістападзе 1974 г. стварылі "Партыю новых сіл", якая перажыла раскол у сярэдзіне 1980-х гг.;

4) Народную нацыянальную партыю, якая была створана ў сакавіку 1970 г Р. Алендрам, А. Карэтам, П. Буске. Далучылася да Нацыянальнага фронту ў 1972 г. [22].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Група “Абарончы саюз” спрабуе адрадзіцца з 2011 г. пад назвай “Маладзёжны абарончы саюз”. Журналіст “Фігаро” Ф. Рамэн адзначаў, што няма сумненняў у тым, што “Маладзёжны абарончы саюз” з’яўляецца спадкаемцам “Абарончага саюзу”. Іх звязваюць агульны сімвал – чорны пацук, аднолькавы стыль: чорная скураная куртка, сонцаахоўныя акуляры, паголеная галава. Ф. Рамэн асцерагаецца таго, што аднаўленая арганізацыя будзе весці такую ж бурную дзейнасць, як папярэдняя. Яго непакоіць тое, што яе сацыяльную базу складаюць маладыя людзі, гатовыя на розныя авантуры ва ўмовах абвастрэння іміграцыйнай праблемы і тэрарыстычнай пагрозы з боку Ісламскага дзяржавы. Дж. Хаян, прэзідэнт “Саюза яўрэйскіх студэнтаў Францыі”, чые актывісты змагаліся з групай “Абарончы саюз” у 1980-х гг., баіцца паўтарэння сітуацыі. Ён не разумее, чаму “Маладзёжны абарончы саюз” не забаронены. Вядома, што асновай “Маладзёжнага абарончага саюзу” з’яўляюцца студэнты ўніверсітэта Пантэон-Аса (Парыж ІІ), рэктар якога, Л. Фогель, заявіў, што не мае паўнамоцтваў для таго, каб забараніць арганізацыю [23].

Адначасова з настальгуючымі па Алжыры з канца 1960-х гг. ствараліся невялікія групы, не звязаныя з вайной, як, напрыклад, утвораная ў маі 1968 г. па ініцыятыве ўладальніка газеты “Фігаро” Р. Эрсана “Група даследаванняў”, якая спрабавала навукова абгрунтаваць расісцкую частку фашысцкай ідэалогіі і надаць ёй прыстойны выгляд. Вядома, што Р. Эрсан калісьці прытрымліваўся сацыялістычных поглядаў, але з пачаткам германскай акупацыі перайшоў на бок маршала А.Ф. Петэна. Улетку 1940 г. заснаваў маладзёжную арганізацыю “Малады фронт”, якая падпарадкоўвалася фашысцкай Нацыянал-калектывісцкай французскай партыі П. Клемянці [24]. Неўзабаве ў кастрычніку 1940 г. ён пакінуў “Малады фронт”. Пры гэтым Р. Эрсан удзельнічаў у выданні нацысцкай газеты “Ганебны слуп” (“Au Pilori”). У 1941–1942 гг у Брэване стварыў лагер, дзе моладзь вучылася нацыяналістычным ідэям. За супрацоўніцтва з нацыстамі ў 1947 г. быў асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі, але ў 1952 г. быў амнісцiраваны [25].

Р. Эрсан часта мяняў партыйную прыналежнасць, што не перашкаджала яму абірацца дэпутатам Нацыянальнага сходу ад кожнай партыі. У 1956 г. ён быў абраны дэпутатам ад радыкал-сацыялістаў. У 1958 г. стаў галістам. З 1967 па 1968 г. меў сувязі з сацыялістамі. Затым вярнуўся ў галісцкую партыю і з 1968 па 1973 г. быў дэпутатам ад галісцкага Саюза дэмакратаў за Рэспубліку. З 1973 г прытрымліваўся цэнтрысцкіх поглядаў і ў 1986 г. быў абраны дэпутатам ад Саюза за французскую дэмакратыю В. Жыскар д’Эстэна [26]. Такім чынам, Р. Эрсан быў чалавекам з непастаяннымі палітычнымі поглядамі, што знайшло адлюстраванне ў створанай ім “Групе даследаванняў”, якая не змагла развіцца ў паўнавартасную палітычную партыю.

Большая частка неафашыстаў падтрымала ўтварэнне Нацыянальнага фронту ў 1972 г. Гэта былі былыя петэнаўцы, ультраправыя экстрэмісты [6, с. 275]. Прычынай узнікнення адзінай партыі стала тое, што пасля атрымання Алжырам незалежнасці ўльтраправыя страцілі большую частку галасоў выбаршчыкаў. Калі ў 1958 г. на выбарах у Нацыянальны сход за іх прагаласавала 2,6% французскіх грамадзян, то праз 10 гадоў іх падтрымала толькі 0,1% [27, p. 16].

Даследчык Ж.-І. Камю ў працы “Нацыянальны фронт” даў наступную характарыстыку Нацыянальнаму фронту: “Нацыянальны фронт ўяўляе сабой аб’яднанне ультраправых, якія выкарыстоўваюць дэмакратычную сістэму для ўстанаўлення аўтарытарнага рэжыму, заснаванага на расавай канцэпцыі нацыянальнай ідэнтычнасці” [7, p. 5]. У.П. Смірноў не адносіў Нацыянальны фронт да неафашысцкіх партый. Ён лічыў, што Нацыянальны фронт прыйшоў на змену неафашыстам, аб’яднаўшы традыцыйныя лозунгі ўльтраправых з інтэгральным каталіцызмам, аўтарытарным папулізмам і эканамічным ультралібералізмам [28, с. 162].

Панаванне на першапачатковым этапе ўнутры Нацыянальнага фронту ідэалогіі, якая мела шмат агульнага з фашызмам, было звязана з тым, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў складзе партыі знаходзіўся лідар французскіх нацыяналістаў-рэвалюцыянераў Ф. Дзюпра, які рэдагаваў партыйныя дакументы [6, с. 275–276]. "Чыстка" Ж.-М. Ле Пэнам Нацыянальнага фронту ад радыкальных элементаў пасля гібелі Ф. Дзюпра прывяла да таго, што зараз неафашысты не маюць ўплыву на грамадзян.

Сувязі з экстрэмістамі стварылі адпаведны адмоўны аўтарытэт Нацыянальнаму фронту, таму яму трэба пастаянна даказваць, што яго ідэалогія не звязана з фашызмам. Асабліва крытыкуе Нацыянальны фронт правацэнтрысцкі палітык Н. Касцюшка-Марызэ. На яе думку, партыя не прапаноўвае для Францыі ніякай будучыні, акрамя нянавісці і ізаляцыі. Н. Касцюшка-Марызэ называе ідэалогію Нацыянальнага фронту разнавіднасцю папулісцкага неафашызму [29, с. 103]. Зразумела, што Нацыянальны фронт з'яўляецца ультраправай партыяй, але заяўляць, што ён неафашысцкі, няправільна.

Сучасных манархістаў таксама няправільна называць неафашыстамі, як гэта рабіў нямецкі гісторык Э. Нольтэ, бо ў іх ідэалогіі не засталося нічога ад фашызму. Навукоўцы лічаць погляды Э. Нольтэ архаічнымі. У 1999 г. англійскі гісторык Р. Турлоў адзначыў, што зробленая Э. Нольтэ прывязка Аксьён Франсэз да фашысцкай традыцыі ўводзіць у зман.

Ультраправыя традыцыйна абапіраліся на адны і тыя колы насельніцтва. Гэта дробная буржуазія і простыя грамадзяне (рабочыя, сяляне). Калі ў краіне была стабільная сітуацыя, ультраправыя не мелі ніякіх шанцаў на прыход да ўлады. У крызісныя моманты іх папулярнасць значна ўзрастала за кошт павелічэння падтрымкі з боку сярэдніх слаёў насельніцтва, у першую чаргу за кошт інтэлігенцыі, што дазваляла ім пераўтварацца ў значную палітычную сілу.

Нягледзячы на тое што сучасныя французскія ультраправыя партыі не падобныя адна да адной, іх аб'ядноўвае тое, што ў іх аснове ляжыць ідэя абароны нацыянальнай ідэнтычнасці, а таксама ахова інтарэсаў свайго народа [29, с. 97]. Ультраправыя адышлі ад заклікаў знішчаць пэўныя народы. У аснове іх праграм ўсё часцей знаходзяцца ідэі антыглабалізму, таму што глабалізацыя знішчае нацыянальную ідэнтычнасць. Аднак калі Нацыянальны фронт да нядаўняга часу выступаў катэгарычна супраць глабалізацыі, то іншыя ультраправыя, як правіла, прымаюць еўрапейскую глабалізацыю.

П. Брэшон справядліва адзначаў, што ўсе палітычныя ідэалогіі з'яўляюцца гістарычным і сацыяльным прадуктам. Яны з'яўляюцца ў моманты важных гістарычных падзей. Напрыклад, Вялікая французская рэвалюцыя прывяла да ўзнікнення рэспубліканскай і контррэспубліканскай ідэалогій, якія ў далейшым развіваліся і мяняліся. Ідэалогіі, якія ўзніклі ў перыяды сацыяльных узрушэнняў, могуць як страціць сваё значэнне (фашызм у Францыі), так і адрадзіцца праз некаторы час, але ўжо ў іншай форме [30, p. 7].

**Заключэнне**

Такім чынам, пераважная большасць сучасных французскіх ультраправых не мае агульнага з фашызмам, нягледзячы на тое, што некаторыя з іх пэўны час падзялялі фашысцкія ідэі, у тым ліку Нацыянальны фронт. Яны выдатна разумеюць, што калі будуць выступаць з расісцкім лозунгамі, то адштурхнуць ад сябе патэнцыяльных выбаршчыкаў. Распаўсюджваючы свае погляды, сучасныя ультраправыя імкнуцца дзейнічаць у рамках заканадаўства. Тыя партыі і арганізацыі, якія дапускаюць ўжыванне гвалту ў дачыненні да асобных нацыянальных меншасцей, не карыстаюцца грамадскай падтрымкай. Нягледзячы на тое што дзейнасць сучасных ультраправых носіць абмежаваны характар, пры ўзнікненні пэўных абставін ультраправыя могуць актывізавацца і прыйсці да ўлады. Нарастанне тэрарыстычнай і імігранцкай пагроз спрыяе росту папулярнасці ультраправых.

***СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ***

1. ***Випперман, В.*** Европейский фашизм в сравнении: 1922–1982 [Электронный ресурс] / В. Випперман // Электронная библиотека RoyalLib. – Режим доступа: http://royallib.com/book/vipperman_volfgang/evropeyskiy_fashizm_v_sravnenii_1922_1982.html. – Дата доступа: 29.06.2017.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. ***Vaxman, S.*** Speaking Terms. Europe's Left and Right are too divided to even talk about it [Electronic resource] / S. Vaxman // Chicago Tribune. – 13.12.1993. – Mode of access: http://articles.chicagotribune.com/1993-12-13/features/9312130011_1_intellectuals-debate-anti-immigrant. – Date of access: 30.06.2017.
3. ***Mestre, A.*** Les élans ratés de la nouvelle droite [Electronic resource] / A. Mestre // Le Monde. – 10.08.2010. – Mode of access: http://www.lemonde.fr/idees/article/2010/08/09/les-elans-rates-de-la-nouvelle-droite_1397188_3232.html. – Date of access: 30.06.2017.
4. ***Феньо, Б.*** ОАС / Б. Феньо. – Москва : Госполитиздат, 1962. – 80 с.
5. Des nostalgiques de l'OAS sur la tombe du Soldat inconnu? [Electronic resource] // Algeria-Watch. – Mode of access: http://www.algeria-watch.org/fr/article/pol/france/nostalgiques_oas.htm. – Date of access: 03.07.2017.
6. ***Васильева, Н. Ю.*** Национальный фронт вчера и сегодня / Н. Ю. Васильева // Французский ежегодник: Правые во Франции / редкол.: А. В. Чудинов (гл. ред.) [и др.]. – Москва : Едиториал УРСС, 2003. – С. 273–290.
7. ***Camus, J.-Y.*** Le Front National / J.-Y. Camus. – Toulouse : Milan, 1998. – 63 p.
8. ***Buzzi, P.*** Le Front national: entre national-populisme et idéologie d'extrême droite / P. Buzzi // Le discours politique en France / Sous la dir. de P. Bréchon. – Paris : La Documentation française, 1994. – P. 15–36.
9. ***Рубинский, Ю. И.*** За колоннами Бурбонского дворца: кризис буржуазного парламентаризма во Франции после второй мировой войны / Ю. И. Рубинский. – Москва : Международные отношения, 1967. – 206 с.
10. Décret du 31 octobre 1968 portant dissolution de l'association dénommée Occidental [Electronic resource] // Legifrance. – Mode of access: https://www.legifrance.gouv.fr/jo_pdf.do?numJO=0&dateJO=19681101&numTexte=&pageDebut=10234&pageFin=. – Date of access: 16.07.2017.
11. ***Rochegonde, A.*** 2000 ans et des podcasts [Electronic resource] / A. Rochegonde // Stratégies. – 07.01.2010. – Mode of access: http://www.strategies.fr/actualites/medias/130092W/2-000-ans-et-des-podcasts.html. – Date of access: 16.07.2017.
12. ***Benoist, A.*** Vu de droite. Anthologie critique des idées contemporaines // A. Benoist. – Paris : Éditions Copernic, 1977. – 607 p.
13. Éléments № 150: Les 40 ans d'Éléments [Electronic resource] // Groupement de recherche et d'études pour la civilisation européenne. – Mode of access: http://grece-fr.com/?p=4015. – Date of access: 01.07.2017.
14. Éléments №144: La diabolisation continue! [Electronic resource] // Groupement de recherche et d'études pour la civilisation européenne. – Mode of access: http://grece-fr.com/?p=3884. – Date of access: 01.07.2017.
15. ***Pech, M.-E.*** L'attentat le plus meurtrier depuis Vitry-Le-François en 1961 [Electronic resource] / M.-E. Pech // Le Figaro. – 07.01.2015. – Mode of access: http://www.lefigaro.fr/actualite-france/2015/01/07/01016-20150107ARTFIG00178-historique-des-attentats-en-france-depuis-1994.php. – Date of access: 03.07.2017.
16. ***Lacouture, J.*** 26 mars 1962, la fusillade de la rue d'Isly à Alger [Electronic resource] / J. Lacouture // Histoire coloniale et postcoloniale. – Mode of access: http://www.ldh-toulon.net/26-mars-1962-la-fusillade-de-la.html#nh1. – Date of access: 03.07.2017.
17. ***Duroselle, J.-B.*** Histoire diplomatique de 1919 à nos jours / J.-B. Duroselle. – Paris : Dalloz, 1993. – 1038 p.
18. ***Харланов, Ю. Ф.*** Тайна двух крестов / Ю. Ф. Харланов. – Москва : Молодая гвардия, 1962. – 144 с.
19. Explosions racistes [Electronic resource] // L'Express. – 23.11.2006. – Mode of access: http://www.lexpress.fr/informations/explosions-racistes_677755.html. – Date of access: 03.07.2017.
20. ***Boehlen, N.*** Les sociétés allemande et à face française l'immigration, 1945–1974: thèse présentée à l'Université de Genève pour l'obtention du grade de Docteur en relations internationales (histoire et politique internationales) / N. Boehlen. – Genève, 2004. – 374 p.
21. Il y a 40 ans, naissait le Front national [Electronic resource] // Libération. – 05.10.2012. – Mode of access: http://www.liberation.fr/france/2012/10/05/il-y-a-40-ans-naissait-le-front-national_851122. – Date of access: 03.07.2017.
22. Parti National Populaire (PNP) [Electronic resource] // France Politique. – Mode of access: http://www.france-politique.fr/wiki/Parti_National_Populaire_(PNP). – Date of access: 03.07.2017.
23. ***Romain, F.*** Élections à Assas: le GUD tente de reprendre pied [Electronic resource]/

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

F. Romain // Le Figaro. – 28.03.2012. – Mode of access: http://www.lefigaro.fr/actualite-france/2012/03/28/01016-20120328ARTFIG00495-elections-a-assas-le-gud-tente-de-reprendre-pied.php. – Date of access: 03.07.2017.
24. In memoriam: Pierre Clémenti [Electronic resource] // Club Acacia. – 28.05.2011. – Mode of access: http://club-acacia.over-blog.com/article-in-memoriam-pierre-clementi-67516901.html. – Date of access: 30.06.2017.
25. Biographie: Hersant Robert (1920–1996) [Electronic resource] // BS Encyclopédie. – Mode of access: http://www.encyclopedie.bseditions.fr/biographie.php?bioid=731&biolib=Hersant+Robert. – Date of access: 30.06.2017.
26. ***Robert Hersant.*** Mandats à l'Assemblée nationale ou à la Chambre des députés [Electronic resource] // Assemblée nationale. – Mode of access: http://www2.assemblee-nationale.fr/sycomore/fiche/(num_dept)/3821. – Date of access: 30.06.2017.
27. ***Perrineau, P.*** Le symptome Le Pen. Radiographie des électeurs du Front national / P. Perrineau. – Paris : Fayard, 1997. – 257 p.
28. ***Смирнов, В. П.*** Традиции Великой французской революции в идейно-политической жизни Франции. 1979–1989 / В. П. Смирнов, В. С. Посконин. – Москва : Изд-во Московского университета, 1991. – 219 с.
29. ***Новожёнова, И. С.*** Франция: Национальный фронт и проблема иммиграции / И. С. Новожёнова // Актуальные проблемы Европы. – Москва : ИНИОН РАН, 2012. – № 4. – С. 97–122.
30. ***Bréchon, P.*** Introduction: partis politiques et idéologies / P. Bréchon // Le discours politique en France / Sous la dir. de P. Bréchon. – Paris : La Documentation française, 1994. – P. 5–14.

Паступіў у рэдакцыю 15.01.2018 г.
Кантакты: alexey.grishel@tut.by
(Грышэль Аляксей Міхайлавіч)

**Hryshel A. NEO-FASCIST MOVEMENT IN FRANCE AFTER WORLD WAR II.**

*The positions of the most significant neo-fascist organizations and groups in France "Europe – Action", "West", "Group of European Civilization Studies", "Organization of the Secret Army", "Defensive Alliance", "New Order" are discussed and compared in the article. It is proved that the existence of many neo-fascist organizations after World War II is not only caused by the rivalry of their leaders, but also by ideological differences. The author concludes that the activities of modern far-right parties have been limited, but under certain conditions the far-right can become more active and come to power. The growth of terrorist and immigration threats contributes to the growth of the far-right popularity.*

**Keywords:** neo-fascist, far-right, nationalism, racism, terrorism, Algerian war, the National Front.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова